ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ДУК «Лагойская
раённая цэнтральная бібліятэка»
__________Н.В.Мяхедка

# ПАЛАЖЭННЕ
аб раённым конкурсе на лепшую кніжна-выставачную экспазіцыю
прысвечаную да 80-годдзя Перамогі савецкага народа
ў Вялікай Айчыннай вайне «Паклон табе, Вялікая Перамога».

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Сапраўдным Палажэннем (далей Палажэнне) вызначаецца парадак правядзення раённага конкурсу (далей Конкурс) на лепшую кніжна-выставачную экспазіцыю (далей Выстава) прысвечаную да 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне «Паклон табе, Вялікая Перамога».

1.2. Палажэнне вызначае патрабаванні да ўдзельнікаў Конкурсу, крытэрыі ацэнкі канкурсантаў, тэрміны правядзення Конкурсу.

1.3. Арганізатарам і каардынатарам Конкурсу з'яўляецца ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка».

1.4. Інфармацыйнае асвятленне Конкурсу ажыццяўляецца праз сайт ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка».

## 2. МЭТА І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ

2.1. Захаванне гістарычнай памяці, асэнсаванне досведу і ўрокаў Вялікай Айчыннай вайны, значнасці ў дасягненні Перамогі над фашысцкай Германіяй.

2.2. Актывізаваць працу бібліятэк да 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне «Паклон табе, Вялікая Перамога».

2.3. Фарміраваць устойлівую цікавасць насельніцтва да гераічнай гісторыі Беларусі, прасоўвання лепшых твораў мастацкай і публіцыстычнай літаратуры аб вайне, чытання літаратуры патрыятычнай накіраванасці, захаванне - культурна-гістарычнай - пераемнасці пакаленняў.

2.4. Развіць і падтрымаць творчы патэнцыял супрацоўнікаў бібліятэк, павысіць іх прафесійнае майстэрства.

2.5. Удасканаліць навыкі бібліятэкараў у афармленні кніжна-выставачных экспазіцый з улікам сучасных патрабаванняў да бібліятэкі як сацыяльна-культурнага цэнтра.

2.6. Выявіць і распаўсюдзіць досвед працы бібліятэк па арганізацыі кніжна-выставачных экспазіцый, укараніць яго ў паўсядзённую практыку.

## 3. ТЭРМІНЫ І ЎМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

3.1. Конкурс праводзіцца з 26 студзеня 2025 года да 1 лістапада 2025 года.

3.2. У конкурсе прымаюць удзел усе бібліятэкі-філіялы ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка».

3.3. Кожная бібліятэка павінна распрацаваць і аформіць разгорнутую кніжна-выставачную экспазіцыю.

3.4. Удзельнікі самастойна выбіраюць від і форму кніжна-выставачнай экспазіцыі. Тэматыка Выставы – 80-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

3.5. Пасля заканчэння работы над Выставай, удзельнікі конкурсу здаюць дакументацыю па Выстаўцы у раённую бібліятэку (сектар маркетынгу): пашпарт выставы, фатаграфіі ў друкаванай і электроннай форме да 1 лістапада 2025 года (Дадатак № 1).

3.6. Удзельнікі Конкурсу вядуць улік эфектыўнасці кніжнай выстаўкі:

- колькасць наведванняў бібліятэчнай выставы (з абавязковым падцверджаннем);
- колькасць выдачы (праглядаў) дакументаў з выставы;
- водгукі чытачоў.

3.7. Для ацэнкі прадстаўленых работ і падвядзення вынікаў ствараецца аргкамітэт і журы конкурсу (Дадатак №3).

3.8. Па папярэдняй узгодненасці ўдзельнікі конкурсу праводзяць прэзентацыю выстаў членам аргкамітэта і журы ў сваіх бібліятэках.

## 4. КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ КОНКУРСНЫХ ПРАЦ

4.1. Адпаведнасць назвы асноўнай ідэі Выставы, яе арыгінальнасць, лаканічнасць.

4.2. Творчае самавыяўленне бібліятэкара аўтара Выставы.

4.3. Адпаведнасць і глыбіня раскрыцця тэмы.

4.4. Запатрабаванасць (эфектыўнасць) Выставы, водгукі карыстальнікаў,

4.5. Наяўнасць афарміцельскіх сродкаў, з дапамогай якіх увасабляецца агульная задума: каляровае рашэнне, выкарыстанне знакавых, прадметных, мастацкіх, дэкаратыўных элементаў.

4.6. Адпаведнасць бібліяграфічнага апісання выданняў на выстаўцы патрабаванням дзейных ДАСТаў.

## 5. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ І ЎЗНАГАРОДЖАННЕ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ

5.1. Пераможцаў вызначыць журы, у склад якога ўваходзяць вядучыя спецыялісты ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка».

5.2. У функцыі аргкамітэта ўваходзіць растлумачэнне ўмоў Конкурсу, ацэнка конкурсных работ і ўзнагароджанняў пераможцаў.

5.3. З 1 па 14 лістапада 2025 г. конкурсная камісія падводзіць вынікі Конкурсу і вызначае пераможцаў.

5.4. Узнагароджанне пераможцаў адбудзецца ў снежні 2025 года.

5.5. Пераможцы Конкурсу ўзнагароджваюцца Дыпломамі і матэр'яльнымі выплатамі ад ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка».

5.6. Інфармацыя аб выніках конкурсу будзе апублікавана на сайце ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка».

## 6. КАНТАКТНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

Адрас: 223141, г. Лагойск, вул. Харчанка, 31, Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка, 53-8-96 сектар маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы Лагойскай раённай цэнтральнай бібліятэкі.

E-mail: lgmetod@logoysk.gov.by. Сайт: https://loglib.by/

**ДАДАТАК № 1**

Пашпарт выставы________________________________________

Прозвішча, імя і імя па бацьку аўтара/калектыва аўтараў__________
______________________________________________________

Назва выставы__________________________________________

Месцазнаходжанне______________________________________

Мэтавае прызначэнне____________________________________

Чытацкае прызначэнне___________________________________

Асноўная ідэя__________________________________________

Колькасць прадстаўленай літаратуры_______________________

Колькасць прадстаўленых экспанатаў______________________

**ЗАЎВАГА**

Пашпарт выставы

Назва выставы

Структура кніжнай выстаўкі:

- раздзелы

- цытаты

- ілюстрацыйны матэрыял

- спіс літаратуры да выставы

**ДАДАТАК № 2**

## СПРАВАЗДАЧА ПА ВЫСТАВЕ

Прозвішча, імя аўтара/калектыўных аўтараў

Назва выставы

Колькасць выданняў на выставе

Тэрміны экспанавання

Дата прэзентацыі выставы

Ацэнка эфектыўнасці кніжнай выстаўкі (колькасць наведвальнікаў выстаўкі, кнігавыдача, водгукі)

Высновы і перспектывы далейшага выкарыстання матэрыялаў выставы

**ДАДАТАК №3**

## АРГКАМІТЭТ І ЖУРЫ КОНКУРСУ

Мяхедка Н.В. - дырэктар Установы;

Глушакова І.М. - заг. сектара маркетынгу;

Любавіна А.В. - бібліятэкар сектара маркетынгу;

Юрэвіч А.С. – бібліятэкар аддзелу фарміравання БФ;

Гнецько І.А. - старшыня першаснай прафсаюзнай арганізацыі.